№ 49. Ausgabe B.

ГОМАН

Цэна с пэрэсылкай і дастаукай да хаты:

на 1 год—4 м. 80 фэн., на ½ году—2 м. 40 ф., на 3 месяцы — 1 м. 20 ф., на 1 мес. — 40 фэн.

Беларуская Віленская часопіс

выходзіць два разы у тыдзень: у аўторкі і пятніцы.

Адрэс рэдакціі: Вільня, Завальная 7.
Адрэс адміністрації і экспэдыціі:
М. Стэфанская 23.

Цэна абвестак:

на 4-ай старане за радок дробнымі літэрамі — 25 фэніг.; дробные абвесткі— па 5 фэн за слова. Абвесткі аб сьмерці — 60 фэн. за лінейку дробн. друкам.

№ 49 (140). Год II. Вільня, 19 чэрвеня 1917 г. Цэна 5 фэн. (3 кап.).

Міністры Польшчы.

18 чэрвеня.

Заходні тэатр:

Фронт Рупрэхта Баварскаго: На каналі Ізэр, наабапол Іпра і на фронці Лябассэ-Сансэ — значная работа артылерыі. На палудзенным заходзі ад Варнэтон. на ўсходзі ад Вэрмэль і пры Лёс адбіты наступленьня ворагоў. На ўсходзі ад Круассі адбіты тры наступленьня англічан.

Фронт нямецкаго Насьледніка: Пасьля ўдачных наступленьнёў проці францускіх акопаў. на фронці Эн і ў заходняй Шамнані агонь крапчэў

На усходнім тэатры і македонскім фронці—палажэньне без перамен.

ПЕЦЯРБУРГ. Заседаючый тут з'езд рад раб. і салд. выбраў за свайго маршалва галаву пецярбурскай рады раб. і салд. Чхэідзэ, і зацьвяйдзіў большасьцю 640 галасоў проці 121 высылку з Расеі швэйцарскаго соцыаліста Грімма.

ШТОКГОЛЬМ. Прэдстаўнік расейскай рады раб. і салд. заявіў на заседаньні голандзка-скандынаўскаго камітэту, што рада раб. і салд. дабіваецца сазыву конфэрэнціі у Штокгольмі. Расейскім дэлегатам загадано даць праўдзівые ведамасьці аб сапраўдным палажэньні ў Расеі. У Штокгольмі будзе выхадзіць газэта, ў каторай будуць друкавацца выпіскі з расейскіх газэт і апавешчэньня рады раб. і салд. Газэта мае выхадзіць зразу ў нямецкай, англіцкай і францускай мовах і будзе называцца „Бюлетэнь Рады Раб. і Салд.; Аддзела загранічных зносін“. Рада раб. і салд. наладзіла спэцыальную камісію, каторая занімаецца толькі аднэй справай — сазывам соцыалістычнаго з'езду у Штокгольмі.

ШТОКГОЛЬМ. Кэрэнскій сказаў дэлегатам трэйцяй арміі, што ён маніцца паслаць на фронт усё апалчэньне. Будзе зроблен набор усіх мужчын да 43 гадоў, у тым ліку і духоўных. Набор адбудзецца такжэ на Каўказі, ў Туркестані і Фінляндіі, ды ўсюды, дзе народ быў звольнен ад набору.

Ва ўсіх меншых местох паўночнай Расеі пануе голад. Міністэр дарог публічна заявіў, што Расея знаходзіцца ў вельмі сумным стані і стаіць перад зваротным пунктам.

ЖЭНЕВА. Плеханова выбралі за члена рады раб. і салд.

РОТТЭРДАМ. Італьянскі пасол у Пецярбургі данёс свайму ураду, што заява аб устанаўленьні пратэктарату Італіі над Албаніей зрабіла ў Расеі надта вялікае ўражэньне.

ЛЮГАНО. «Corr. d. Sera» даносіць, што тымчасовы урад выдаў пашпарты на падарожу у Штокгольм пэснадцаці членам рады раб. і салд.

ЖЭНЕВА. Францускіе газэты даносяць с Пецярбурга, што ў апошнім часі на расейскіе чыгункі, масты на іх і т. д. робяцца чысьленые пакушэньня. З гэтай прычыны ўласьці загадалі пілнаваць усіх чыгунак і мастоў салдатам.

РОТТЭРДАМ. На сходзі саюза партовых работнікоў пастаноўлено зрабіць агульную забастоўку.

ВАРШАВА. Па прэдлажэньню каманды польскіх легіонаў гэнэрал губэрнатар Бэзэлер назначыў у польскую армію 8 нямецкіх афіцэроў.

ВЕНА. Як даносяць са Львова, на мейсцо міністра прэзыдэнта Польскаго Каралеўства будзе назначэн кн. Здзіслав Любомірскі, цяперашні прэзыдэнт Варшавы; каліж ён адмовіцца,—дык быўшый аўстрыяцкі пасол у Вашынгтоні, гр. Тарновскі.

ШТОКГОЛЬМ. Англіцкая дэлегація на соцыялістычную конфэрэнцію у Штокгольмі складаецца с 4 членоў партыі большасьці і 3—меншасьці.

БЭРН. „Times“ даносіць, што паўмільёна работнікоў у найбліжэйшых днях пададуць ураду жаданьне сваё, каб ён памог бы ім дабіцца павялічэньня платы ва 10 марак у тыдзень.

ЖЭНЕВА. У Італіі шырыцца агітація за устанаўленьне рэспублікі. Пэрэварот падгатаўляецца такім жэ спосабам, як у Рэсеі.

РЫМ. Кароль Константын с каралевай і насьледнікам Георгам прыбылі ў Мэссіну, а адтуль паехалі праз Мілан у Швэйцарыю, куды ім дадзен вольны праазд.

Вільня, 19 чэрвеня.

Работніцкіе організаціі маюць сілу толькі тады, калі яны створэны і вядуцца самімі работнікамі, пабудованы на аснові самачыннасьці масс. Калі-ж толькі іх «робяць» для работнікоў людзі, якіе стаяць здалёку ад працоўнага народу, дык с такой работы — мала карысьці,

Прыгледаючыся да работніцкіх організацій у нашым месьці, мы бачым, што тут чысло іх у апошнім часі—даволі значнае. Бадай, усе фахі організованы у прафэсыональные саюзы. Апрыч таго, ўсе саюзы злучае ў вадно цэнтральнае бюро, каторае занімае кіраўнічае мейсцо у работніцкім жыцьці Наладжэны дзьве работніцкіе танные страўні, дзьве работніцкіе коопэратывы, работніцкіе клюбы. І ўсе гэтые установы вядуць самі работнікі, чысло-ж інтэлігентоў у іх—зусім незначнае.

Мы мелі магчымасць пазнаёміцца з організаціей работніцкай страўні (хрысьціянскай) пры Вароньняй вуліцы ў Вільні. Тут увесь штат працаўнікоў- гэта работнікі, і толькі між членамі ураду бачым пару інтэлігентоў. Гаспадар страўні, скарбнік, рэгістратар, бухгальтэр і т. д —усе работнікі І работа ідзе зусім добра, лад пануе прымерны.

Гэтак сама—ўсюды. Віленскіе работнікі, узяўшы ў гэты цяжкі час усе сваe справы ў свае рукі, маюць знаменітую школу самачыннасьці. Перад вайной з організованым жыцьцём былі знаёмы толькі больш сьвядомые работнікі, організованые ў палітычных партыях,—а прафэсыональные саюзы былі надта малачысьленые. Сваім гаспадарчым жыцьцём нашы работнікі як-бытцым зусім не жылі. Вайна прымусіла іх звярнуць увагу і на гэту галіну жыцьця.

Трэба сказаць, што, поруч з дэмократызаціей усяго грамадзкаго жыцьця, якая бязспорна настане пасьля вайны, і ў віленскай местовай гаспадарцы адбудуцца вялікіе перамены. Яна ўжо не астанецца ў руках польскіх камянічнікоў, а пяройдзе да ўсяго народу—бяз рожніцы стану і нацыянальнасьці. Само сабой, што тады работнікі павінны будуць даць і с паміж сябе чынные сілы,—і яны, прайшоўшы школу грамадзкай працы ў сваіх прафэсыональных і экономічных організаціях, здалеюць іх даць.

Pro memoria.

Ад часу «знаменітаго» выступленьня польскаго грамадзянства нашаго краю на адкрыцьці памятніка царыцы Кацярыны II у Вільні мы не помнім ніякіх падобных польскіх палітычных актоў. Толькі «мэморыял» да нямецкаго імперскаго канцлера, падпісаны 44-мя прэдстаўнікамі «ўсіх кірункоў польскай палітычнай мысьлі ў Літве», мае значэньне такой самай—нават яшчэ вялікшай меры. Вось, гаворачы аб «мэморыале», мімаволі прыходзіць на думку маніфэстація вернасьці царскаму трону і самадзержаўнай Расеі, якую ў 1904 гаду перад памятнікам Кацярыны II зрабілі 50 прэдстаўнікоў польскаго грамадзянства з Беларусі і Літвы.

У нашы рукі папала надрукованая ў 1905 гаду у Львові (Księgarnia Narodowa») кніжка: „Z powodu uroczystości Wileńskiej“. Вось, вязанка даных аб тэй справі.

Гэта было ўжо ў часі вайны з Японіей — у верасьні 1904 году. Пад той час расейскі царскі урад вельмі рупіўся аб тое, каб паказаць усяму сьвету, што наш край, гвалтам прылучэны больш сотні лет таму назад да Расеі, «ўсім чым рад» пад «ласкавай царскай апекай». І дзеля гэтаго «лібэральны» міністэр кн. Сьвятополк Мірскій надумаў выкарыстаць палякоў, каторые с прычыны паўстаньнёў 1831 і 1863 гадоў лічыліся за самы неспакойны, бунтаўнічы элемэнт. Ведаў кн. Мірскі, с кім мае дзело, звертаючыся да тутэйшых польскіх паноў. Ведаў, што за белые камэргэрскіе парткі, за ордэр, за ласкавае слова іх можна завясьці, хоць куды. І даволі было расейскаму міністру, як пішэ аўтор кніжкі, «сьвіснуць на палякоў», і тые пакорна пайшлі пад памятнік Кацярыны і сукланіліся перад тэй, каторая пазбавіла наш край волі...

Кн. Сьвятополк-Мірскі перад тым быў віленскім гэнэрал-губэрнатарам і, само сабой, жыў у дружбе с польскімі панамі. Прыехаўшы ў Вільню, ён 1 верасьня 1904 году запрасіў у гэнэрал-губэрнатарскі палац на тайную нараду дзевяць паноў: Гіполіта Гечэвіча, Александра Любаньскаго, Язэпа Монтвілла, Паўла Коньчу, Ігната Парчэвскаго, Кароля Сальмоновіча, гр. Антона Тышкевіча, гр. Язэпа Тышкевіча і Міхала Вэнславскаго. Міністэр «ласкава» прамовіў да іх, кажучы між іншым: „Прашу вас, паведаміце ўсіх сваіх знаёмых, што для вас (палякоў) наступае новая эра... Але каб я мог заступацца за вас, вы, паны, павінны мне памагчы. Вы павінны быць на адкрыцьці памятніка, каб брат Яго Вялічэства, каторы мае сюды прыехаць, мог аб вас сказаць Гасудару. А на нябытнасць вашу будзе звернена увага і яе будуць лічыць за знак вашай няшчырасьці“.

І польскіе паны пастанавілі выказаць расейскаму царскаму правіцельству сваю „шчырасць“. Праўда, с-паміж дзевяці запрошэных на тайную нараду да міністра чацьвёра на адкрыцьце памятніка не з’явіліся: Язэп Монтвілл, Ігнат Парчэвскі, К. Сальмоновіч і М. Вэнславскі. Затое польскае панство гэтак горача адгукнулося на запрошэньне міністра, што перад памятнікам апынулося ажно 50 гэткіх паноў з Віленскай, Ковенскай і Гродзенскай губэрній. Гэта былі:

Гр. Адам Плятэр, гр. Мар'ян Плятэр, гр. Александар Плятэр, гр. Юрый Плятэр, кн. Стан. Чэтвэртынскій, кн. Богдан Огінскі, гр. Антон Тышкевіч, гр. Язэп Тышкевіч, гр. Язэп Прждздецкі, Константын Скірмунтт, Гэнрык Скірмунтт, Язэп Гліндзіч, Казімір Шэмётт, Александар Сегэнь, Тэльшэвскі, Антон Чэховіч, гр. Адам Чапскі, гр. Александар Чапскі, Александар Любаньскі, Эдмунд Борткэвіч, Гіполіт Мілевскі, Цэзары Станевіч, Кароль Больцэвіч, Гіполіт Гечэвіч, Александар Хомінскі, Ігнат Тукалло, Павал Коньча, Францішак Коньча, гр. Людвік Грабовскі, Леон Ваньковіч (сын), Станіслаў Блажэвіч, Эдвард Соколовскі, Алекс. Мэйштовіч, Сымон-Язэп Мэйштовіч, Густав Бржозовскі, Владыслаў Кевліч, Сымон Комаровскі, Кар. Косьцялковскі, Зыгм. Мацкевіч, Ян Котвіч, Люцііян Кобылінькі, Аполінары Мімульскі, Дулевіч, Леон Контрым, Станіслав Когновіцкі, Язэп Козаковскі, Ізыдор Ромэр, Казімір Швойніцкі, Гэрубовіч Вірыон.

Як жэ тлумачылі гэтые паны сваё выступленьне?

Аўтор паменёнай брашуркі дзеліць іх на дзьве групы. Адны — „пайшлі ратаваць сваю нацыянальнасць, ганьбючы яе“, ды не разумелі добра самі, што яны робяць. „Другую вялікую групу становяць тые, для каторых польская нацыянальная справа ў Літве перэстала істнаваць. Яны сьвядома і яўна, першы раз ад часу Городла і Любліна, разарвалі на грунці нацыянальных спраў Унію Літвы с Польшчай“. І гэта зрабілі ўжо „ня толькі некольні людзей, якіе голасна прызнаюцца, што „ня хочуць мець нічога супольнаго, як палякі, с Польскім Каралеўствам, Галічынай і Познаньню“, але і даволі шырокіе кругі, перэважна землеўласьнікі, солідарные моральна ў Літве з выступленьнем безпасрэдных учасьнікоў віленскаго сьвяткаваньня. „Мы хочэмо, —кажуць яны, — за ўселякую цану захаваць нашу мову і веру. Урэшці мы не звязаны ніякай солідарнасьцю с короніярамі, галіцыанамі, пазнанцамі“...

Скуль жэ цяпер у тых самых польскіх паноў з’явілося жаданьне ўжо нават не аднаўленьня уніі, а проста далучэньня нашаго краю да Польшчы? Адказ можэ быць толькі адзін: як раней яны гнулі шыю перад расейскім самадзержавіем дзеля сваей карысьці, так і цяпер сталіся «патрыотамі» монархічнай Польшчы, маючы надзею, што пад крылом польскаго караля яны ўмацуюць сваё панаваньне над цёмнымі массамі нашых селян.

І. Мелешка.

Супрасльская друкарня.

«Bialyst. Ztg.» у доўгай стацьці апісвае знаменітую кляшторную друкарню у Супрасьлі. На жаль, газэта кожын раз, дзе трэба ўжыць слова «беларускі», кажэ «славянскі», ды гэтак, трэба думаць, несьвядома, укрывае ад сваіх чытачоў, што друкарня ў Супрасьлі была беларуская і што ў ей друкаваліся беларускіе кнігі.

Вось, некаторые данные з гэтай стацьці.

Супрасльская друкарня належыць да чысла найбольш старых між славянскімі друкарнямі. Першы гістарычны дакумэнт аб яе істнаваньні адносіцца да 1687 году. У тым дакумэнці полацкі біскуп Кіпрыан Чэхоўскі кажэ, што трэба ў Супрасьлі адкрыць ешчэ аптэку, бо друкарня тамака ўжо ёсць. У манастырскім рээстры 1674 г. архімандрыт Гаўрыла Коленда нічога аб ей не ўспамінае, але ў 1693 г., пасьля сьмерці Чэхоўскаго, ў манастыры было 500 малітвенікоў. У манастыры друкаваліся, праўда, і кніжкі польскіе ды лацінскіе, але літэры да іх пазычалі з Вільні. Гэта відаць з загаду мітрапаліта Льва Заленскаго вярнуць шрыфт у Вільню. У пачатку XVIII сталецьця супрасльская друкарня друкавала лацінскіе і польскіе кніжкі ўжо сваім шрыфтам. Архімандрыт Леў Кішка (1709—1728 г.г.) значна пашырыў друкарню, і яна друкавала ня толькі малітвенікі, але і школьные падручнікі, славары, календары і матэматычные творы. Польская кракоўская акадэмія, завідываючы супрасльскай друкарні, дамагалася падчыненьня апошняй яе цэнзуры. 13 марца 1713 г. выдан дэкрэт Папежа, падчыняючы гэту друкарню цэнзуры папескаго нунція ў Польшчы. У 1721 гаду было забаронено друкаваць календары і матэматычные кнігі без пазваленьня кракоўскай акадэміі. У 1727 гаду ей дадзено монопольнае права на друк уніяцкіх малітвенікоў для ўсіх царквей і манастыроў па цане 4 талеры за штуку. Дзякуючы гэтаму манастыр меў аграмадные даходы, за якіе пабудованы вялікіе каменные дамы, што стаяць і дагэтуль. Манастыр быў гэткі багаты, што мог пазычыць гэтману Браніцкаму ў Беластоку ў 1727 гаду 90.000 гульдэноў. Друк кніг адбываўся ў такіх размерах, што ў 1768 гаду яго прышлося на нейкі час прыпыніць, каб распрадаць зроблены запас. У 1791 і 1792 г.г. тут друкаваліся і расейскіе староверскіе кнігі — псалтыр і малітвенікі. Манастыр меў сваю паперню, каторая выробляла паперу з водным знакам — абразом Мары. У 1790 гаду друкарні дадзен прывілей В. Кн. Літоўскім, Станіславам Аўгустам.

У Вільні і ваколіцах.

× **Беларуская народная страўня.** Беларускі Камітэт адкрывае гэтымі днямі сваю народную страўню пры Сьв.-Юрскім праспэкці 22, ў падворку.

× **Адкрыцьце вячорнай работніцкай страўні** пры агульна-работніцкім культурным саюзі (Віленская 20, 3) адбудзецца ў Сераду, 20 чэрвеня, а 6 гадз. вечара.

× **Выплата „пайка“ жонкам запасных** за месяц май г. г. будзе адбывацца у III аддзелі апекі над беднымі пры нямецкім Stadthauptmann'е Вільні, Домініканская 2, пакой 143, ад 8 да 12 г. раніцай і ад 4 да 7 вечара ў гэткіе дні:

для	4	цыркулу	—20, 21 і 22 чэрв.
„	6	„	—23 чэрвеня
„	7	„	—25 „
„	8	„	—26 і 27 „
„	1	„	—28 „
„	5	„	—30 чэрв. і 2 ліпня
„	3	„	—3 ліпня
„	2	„	—4 „

Жонкі запасных, каторые ў назначэные для іх дні ня возьмуць грошы, павінны звертацца тудыж 5 і 6 ліпня ў гадзінах чыннасьці кассы. Пасьля 6 ліпня падмогі за май выдаваць ужо ня будуць.

× **Заяўкі і выяўкі.** Ад 18 чэрвеня заяўкі і выяўкі жыхароў места Вільні трэба рабіць у нямецкіх паліцэйскіх цыркулах.

× **Тэмпэратура.** Найвышэйшая і найніжэйшая тэмпэратура за апошніе дні была (па Цэльсію):

	найвыш	найніж.
13—14	+ 22°	+ 7°
14—15	+ 24,4°	+ 9°
15—16	+ 27°	+ 9°
16—17	+ 29,5°	+ 10°

З усяго Краю.

Забарона.

Глаўнакамандуючый на Ўсходзі загадам 25 мая 1917 г. забараніў карміць каней і іншую дамовую жывёлу аўсом і іншым збожжэм ад 15 чэрвеня да 15 верасьня. У стайнях і аборах нельга пасьціляць саломы, замест каторай трэба ўжываць мох, лісьці, іглы, трасьнік, апілкі і торф.

Разводка тытуну.

Глаўнакамандуючый на Усходзі загадывае, каб кожын, хто пасадзіў больш за 10 расьлін тытуну, не пазьней 1 ліпня г. г. заявіў начальніку павету аб засеяным абшары у квадратных мэтрах, аб чысле расьлін тытуну і аб чысьле курцоў у яго хаці. Не пазьней, як 15 сьнежня, ён павінен адпаведную да абшару засеянай зямлі меру тытуну здаць паветовому начальніку за плату. Часць тытуну ўласьці пакідаюць гаспадару дзеля яго ўласнаго ужытку.

Новые «нямецкіе рублі».

Новае выданьне «нямецкіх рублёў» крыху рожніцца ад ранейшых. Тэкст аб карах на бумажках па 50 кап., 1, 3, 10 і 25 руб. зраўнован з адпаведным тэкстам

Скарб на сьв. Яна.

Недалёка каля бору
Жыў стары лясьнік Мацей,
І жану ён меў Тадору,
А з ёй с поўкапы дзяцей.
Цэлы век ён цяжка біўся:
Сіратой жыў з малых лет;
Трэба-ж, рана ажаніўся
І пашоў па службе ў сьвет.
Цяжкаж было і разжыцца:
Ня меў зямлі ён ні куска;
Дзеткі сталі знахадзіцца,
У жаны што год—дачка!
І багаты мае смагу,
Што тут з дочкамі зрабіць?
Цяпер, братцы, без пасагу
Тавар такі трудна збыць.
Ось, хрэзьбіны зрабіць цяжка,
Трэба кабзу развязаць;
Водкі пойдзе тут не пляшка,—
А пасаг, дык скуль узяць?
Раз карова захварэла,
Раздуло яе, аж страх!
Свіньня парасят паела,
Вот і думай пра пасаг.
Грызла яго і Тадора,
Што дачок не убіраў.
Меў Мацей не мала гора!
Што рабіць? і сам не знаў.
Чуў ён раз такую казку
(Так казала калісь маць):
Можна ўбіцца чарту ў ласку
І душу сваю прадаць.
Сарваць с папараці кветку
(Яна можэ раз цьвісьці
На Сьвятога Яна ў летку),—
Чорт паможэ скарб знайсьці.
Тады будзе той багаты,
А чорт будзе ўсё рабіць,
Хоць няйдзі нікуды с хаты,
І вясёла можна жыць.
Вот ідзець Мацей да лесу.
Цэлу ноч там прасядзеў!
Аддаваў душу ўжо бесу
І на папараць глядзеў.
Хоць і добра угледаўся,
Цэлу ноч сусім не спаў,—
Цьвет і чорт не паказаўся
І душы яго не браў.
„Мне і чорт не спагадае,
Гдзеш тут мне забагацець?
Вотжэ доля праклятая
Ніхай згіне-прападзець!“
Хмарны Мацей пасьля тога,
Ен ня мог ні есць, ні спаць.
Перастаў хваліць і Бога
Усё роўна прападаць!...
Аж прысьнілося Мацею:
(Цяжкі сон тады ён меў,
Бо, нагнаўшы раз алею,
Добра кашы з ім пад’еў).
Ідзе з лесу ён да дому,
Позны ў ночы быў той час;
Глядзь: гарыць агонь бяз лому
Бытцым сьвечачка якраз.
„Пэўне скарб мне паказаўся?“
Стаў Мацей сябе пытаць.
Шапку зняўшы, пражагнаўся
І давай зямлю капаць.
Капаў, капаў, аж пот ліўся,
Закіпела ў жылах кроў.
Вот як штурхнуў—і разбіўся
Саган поўны дукатоў.
„Божэ! Божэ, вот багаты!“
Думаў радасна Мацей
„Толькі як занесць да хаты?“
Давай класць ў кішэнь барджэй.
А кішэнь трашчыць і рвецца.
Ен за пазуху наткнуў.
Глядзіць—многа астаецца:
І паловы не забраў.
„Закапаю і прыеду
Лепей з возам“ думаў так,
„А каб не згубіць і сьледу
. . . . зраблю знак.
Зноў капае, хоць і змогся.
Скарб назад, як ёсць, зарыў
І аж эхо разляглося
Як на верху знак рабіў.
Тут Тадора ў сьне пачула:
„А каб ты,—крычыць,—прапаў“
Пад бок мужа таўканула:
„Глядзі Мацей, ты . . . .“
(Можэ будзе хтось стыдацца
Слово гэта і чытаць,
Прашу лепей дагадацца
І да складу дасказаць).
„Не мешай ты мне, Тадора“—
Адказаў ей муж у сьне.
„Мы багаты будзем скора:
Будзе дзеткам, табе, мне!“...

Янка Быліна.

Пісаў у Медніках
5—VI—17 г.

на 100-рублёўках. Апрыч таго зроблены невялікіе перамены ў напісах аб цэннасьці бумажэк. Пуліку прызываюць браць гэтые бумажкі, бо, сколькі вядома, падробленых дагэтуль у абароці німа.

БЕЛАСТОК. Цэнтр цяперашняй беластоцкай прамышленасьці — гэта выраб цукеркоў. Ужо перад вайной Беласток рассылаў свае цукровые вырабы па ўсей Літве і навт у Польшчу. Спэцыяльнасць Беластоку—вядомые цёмные сьметаковые цукеркі.

У 1914 гаду Беласток пасылаў шмат цукеркоў на фронт — у тыдзень на 600 руб.

БЕЛАСТОК. Над усім местам узнімаецца незакончэны расейскі сабор. Сьцены яго відаць здалёку, пад'ежджаючы чыгункай. Да упадку Варшавы, з будовай яго вельмі сьпешаліся, і перад прыходам немцоў яго блізка зусім закончылі — прынамсі зверху. У сярэдзіне — сьцены голые, і там, дзе павінен быць аўтар, стаяць толькі пустые бочкі ад вапны і гіпсу. Чы незаможная праваслаўная колонія ў Беластоку здалее закончыць сабор за свае грошы,— сказаць вельмі трудна.

КОЎНА. Філон Гашарынскій, жыўшый пры Маскоўскай вул. 7., 2-га чэрвеня пайшоў на вёску і куляць спажыўные прадукты с таго часу прапаў. Баяцца, што з ім здарылося нешчасьце.

КЕЛЬМЫ. Хлопцы Юльян Петрыло, 12 гадоў, Владыслаў Барстайко, яго брат Вацлаў і Браніслаў Буткус гулялі з лежаўшай неразарваўшайся гранатай, -катора пры гэтым узарвалася. Усе хлопцы цяжка паранены і перавезены ў тутэйшые бальніцы.

СУВАЛКІ. У вялікім садзі за Сэмінарыей, пры Вялікай Местовай вуліцы, устроен прымерны гарод для ўсіх сувальскіх школ. Другі падобны гарод устраіваюць пры Шоссэйнай вуліцы.

ЛІБАВА. Больш за 200 дзесяцін зямлі ўзялі местовые жыхары пад гароды.

Блізка трэйцяя часць вучнёў Курляндіі прыпадае на лібаўскіе школы.

У местовых страўнях выдаюць што-дзень 13.000 порцій, у тым ліку 3.000 дарма.

Афіцыяльны аддзел.

Апавешчэньне.

Глаўнакамандуючый на Усходзі (Oberquartiermeister) пазволіў у межах местоваго округа Вільні цывільным асобам выходзіць са сваіх дамоў ці двароў у летніе месяцы да 30 верасьня 1917 г. ўлучна **да 11 гадзіны вечара** без Nachtausweis'a (пазваленьня хадзіць у начы).

Вільна, 13 чэрвеня 1917 г.

Der Stadthauptmann
Polizeiverwaltung
I. V.
Kessler.

Апавешчэньне.

1000 марак награды.

2 чэрвеня ў фольварку Какішкі, на поўначы ад Ракунаў, Іоганішкельскаго пав., чацьвёра жыхароў былі забіты і абрабованы бандаю з васьмі душ. Ня гледзячы на шырокае сьледзтво, дагэтуль на сьляды ліхадзееў, як здаецца, людзей **тутэйшых**, не папалі.

Хто затрымае ліхадзееў і магчымых супольнікоў іх, або данясе, хто яны і дзе укрываюцца, ды гэтак паможэ арэштаваць і пакараць іх, таму дадуць награду да 1000 марак.

Усе ведамасьці трэба падаваць п. паветовому начальніку у Іоганішкелях, або на найбліжэйшай жандарскай станцыі.

Цяжкіе кары ждуць таго, хто дасць ліхадзеям ці іх супольнікам схоўку, або якую-будзь падмогу.

Вільна, 12 чэрвеня 1917 г.
Der Chef der Militärverwaltung Litauen
Franz Josef Fürst von Isenburg-Birstein
Oberstleutnant á la Suite der Armee.

Рэволюцыя у Расеі.

МАСКВА. «Русск. Сл.» у нумэры з 8 мая пішэ, што украінская партыя социалістоў-рэволюцыонероў на сваім з'езьдзі прызнала за сваю апошнюю мэту поўную социалізацыю зямлі (пераход яе на ўласнасць агульна-грамадзкую), а пакуль што дабіваецца аддачы ў межах Украіны ўсіх зямель габінэцкіх, удзельных, манастырскіх і дворных у украінскі зямельны фундуш. З гэтаго фундушу зямлю будуць даваць дзеля ўжытку людзям, працуючым на ральлі, цераз грамадзкіе організацыі. Да часу правядзеньня ў жыцьцё зямельнай рэформы тымчасовы урад павінен забараніць усе прыватные опэрацыі з зямлёй і ўчыніць энэргічные крокі, каб прыпыніць дзікае нішчэньне лясоў.

З'эзд пастанавіў падтрымліваць тымчасовы урад датуль, пакуль яго палітыка будзе згодліва з інтэрэсамі працоўнаго народу. На думку з'езду, на мірнай конфэрэнцыі павінны быць і прэдстаўнікі недзержаўных нацыональнасьцей.

ПЕЦЯРБУРГ. (П.Т.А.). Спаўніцельная камісія рады раб. і салд. апавешчае ў адказ на пісьмо Томаса, Гэндэрсона і Вандэрвельда **заяву аб праграме** праектаванай радай раб. і салд. **міжнароднай социалістычнай конфэрэнцыі.** У заяве гаворыцца, што расейская рэволюцыя паказала канечную патрэбу міра і еднасьці работнікоў усіх краёў дзеля гэтай мэты. Мір павінен быць без аннэксій і контрыбуцій, ня гледзячы на вымогі імпэрыалістычных і ваенных інтэрэсоў. Калі конфэрэнцыя прызнае права ўсіх народаў становіць аб сабе, дык члены конфэрэнцыі без вялікай труднасьці дойдуць угоды аб будучыне Эльзас-Лётарынгіі і іншых зямель і аб звароці страт старонкам, спустошэным вайной. Зварот страт ня будзе мець нічога супольнаго с контрыбуціей, якую накладаюць на званую старану. Социалістычная конфэрэнцыя можэ дайсьці ўдачы толькі тады, калі учасьнікі яе будуць чуць сябе не за прэдстаўнікоў ваюючых старон, а за дэлегатоў з'еднанай работніцкай клясы дзеля устанаўленьня міра.

ПЕЦЯРБУРГ (П.Т.А.). Агульны з'езд дэпутатоў усіх рад раб. і салд. Расеі пачаўся сягоньня. Прыехало больш за 700 дэпутатоў.

Генерал Лукомскі назначэн за начальніка глаўнаго генэральнаго штабу пры глаўнакамандуючым. Адмірал Максімов—за начальніка адміральнаго штабу пры глаўнакамандуючым.

Камісія дзеля выработкі закона аб сазыве устаноўчаго сэйму падала 21 голас проці 9 за пропорцыональные выбары.

Міністэр заграпічных спраў, Тэрэшчэнко, аддаў францускаму міністру Тома дакумэнт, у каторым гаворыцца: „Расея у змаганьні з ворагамі бароніць вялікую ідэю волі і мае на мэці дайсьці агульнаго міра на такіх асновах, каб гвалты і імпэрыалістычные выступленьня з якога-будзь боку былі немагчымы. Расея не дабіваецца заваевацельных мэт. Дэмократыя Расеі з радасьцю вітае пастанову саюзьнікоў згодне з жаданьнем тымчасоваго ураду перэглядзець нанова умовы аб ваенных мэтах. Дзеля гэтаго мы прэдлагаем зрабіць конгрэсс прэдстаўнікоў саюзных дзержаў. Падпісаная ў Лондоні 5 верасьня 1914 г. умова, каторая выключае магчымасць сэпаратнаго міра, ня будзе разгледацца на конгрэссі".

ЛОНДОН. «Times» даносіць с Пецярбурга, што ў Расеі палажэньне становіцца ўсё менш карысным для саюзьнікоў. Праца Тома, Гэндэрсона і Вандэрвэльда на карысць саюзьнікоў ня споўніла укладаных на яе надзей. Німа спорки, што цьвёрдая пастанова саюзьнікоў ваеваць да поўнай пабеды не спатыкае спогаду ў Расеі.

ПЕЦЯРБУРГ. «Реч» пішэ, што адказ саюзьнікоў нікога ў Пецярбурзі не здаволіў. Социалістычные газэты бачуць у ім праграму імпэрыалістычных ваенных мэт, на каторые рэволюцыйная Расея ня годзіцца. Левая прэсса дамагаецца адвярнуцца ад Англіі, калі яна ня згодзіцца на новые дыплёматычные крокі. Газэты «большэвікоў» грозяць крайнімі крокамі.

ПЕЦЯРБУРГ. (Рэўтэр). Урад загадаў выдаліць з Расеі швэйцарскаго социаліста Робэрта, Грімма, вінавацючы яго, бытцым ён—мірны агент Нямеччыны.

АПАРАНДА. Паводлуг чутак, англіцкі і францускі паслы выехалі с Пецярбурга заграніцу.

ШТОКГОЛЬМ. Даносяць, што прапаўшые некольні тыднёў таму назад з расейскаго міністэрства тайные дакумэнты апынуліся ў Лондоні.

КОПЭНГАГА. Нязгодлівасць між Керэнскім і партыей соц.-рэв. усё узрастае.

Міністэр працы, Чэрнов, член соц.-рэв. партыі, сказаў у сваей прамові: „Мы не дапусьцім, каб Керэнскій стаўся расейскім Бонапартам!"

«Нов. Вр.» вінаваціць міністра фінансоў Шінгарёва, што ён спэкуляціей на расейскай валюці абязцэніў заграніцай расейскі рубель.

На апошніх выбарах у пецярбурскую местовую думу за социалістычны блок пададзены 507.982 галасы, а за буржуазыйные партыі—166.309. Максімалісты атрымалі 117.760 галасоў.

Жалезнадарожнікі, каторые працуюць на чыгунках, якіе вядуць на фронт, пастанавілі ўсемі галасамі не рабіць забастовак бо яны суляць арміі галодную сьмерць. Глаўные камітэты чыгунак, якіе вядуць у Пецярбург, прынялі падобную рэзолюцыю большасьцю 12 галасоў проці 6.

Тымчасовы урад скасаваў закон, каторы дапускаў карыстаць с працы жанок і дзяцей у начы і ў капальнях.

ШТОКГОЛЬМ. «Реч» нападае на галаву крайніх социалістоў, Леніна, кажучы, што яго партыя і яго газэта «Праўда» — ядыные вінавайцы нязгоды ў Расеі. «Реч» дамагаецца ад ураду высылкі Леніна з Расеі.

Палкі 45, 46, 47 і 52 сёмай арміі зрабілі спробу падняць бунт, але ад іх адабралі аружжэ.

З'езд селян у сваей рэзолюціі вострa асудзіў дэзэртэрство і прызывае грамадзянство энэргічна бароцца з гэтым злом.

ШТОКГОЛЬМ. Галава боўгарскіх соц.-дэм., Сахаров, сказаў, што ён лічыць немагчымай монархістычную контррэволюцію ў Расеі. У далейшую вайну зімой ён ня верыць.

ЛЮГАНО. Пецярб. карэспанд. „Corr. della Sera" даносіць, што тымчасовы урад у згодзі з радай раб. і салд. пастанавіў стасаваць вострые крокі проці неслухмянаго Кронштату.

ШТОКГОЛЬМ. Орган расейскаго міністэрства «Русскій Інвалід» у нумэры з 2 чэрвеня пішэ:

„У часі пераввароту у Кронштаці рабіліся страшэнные рэчы. Нялюбых начальнікоў забівалі са страшэннымі мукамі. У вастрогах з афіцэрамі абходзіліся горш, чым у часі царскаго панаваньня—с катаржанамі ў кайданах.

ПЕЦЯРБУРГ. 12 чэрвеня 2 кулемётны полк устроіў на вуліцах дэмонстрацію, ідучы са знамёнамі, на якіх былі надпісы: „Вітаем кронштацкую раду работнікоў!"

Англіцкі консул у Одэссі прызывае англіцкіх падданых да выезду с Херсонскай губэрні.

РОТТЭРДАМ. «Daily Chronicl» даносіць с Пецярбурга, што Іркуцк аб'явіў сябе незалежным.

Место Кірсанов, Тамбоўскай губ., аб'явіў сябе незалежным. Пры стычцы мейсцоваго ураду с прэдстаўнікамі тымчасоваго правіцельства забіты 8 душ. Прэзыдэнт мейсцоваго ураду, Хрунёв, арэштован.

У Астрахані арэштавалі 1.300 дэзэртэроў, у Жытоміры — 10.300.

ЛОНДОН. «Daily Mail» даносіць с Пецярбурга:

Царыцын, Херсон і Кірсанов аб'явілі сябе за незалежные рэспублікі.

ШТОКГОЛЬМ. Рада раб. і салд. у Херсоні, дзе перэважываюць большэвікі, аб'явіла у сябе незалежную рэспубліку.

ПЕЦЯРБУРГ. (П.Т.А.). Газэты даносяць аб адстаўцы глаўнакам. паўн. зах. фронтам, Драгомірова, на мейсцо каторага назначэн Клэмбовскі. Гэтак сама даносяць аб адстаўцы глаўнакамандуючаго на Каўказі, Юдэніча, замест каторага, назначэн Пржэвальскій. Адмірала Максімова, глаўнакамандуючаго балтыцкім флотам, замяніў Верэсовскій.

ПЕЦЯРБУРГ. Начальнік балтыцкаго флоту даносіць, што 16 мая прапала бяз сьледу расейская падводная лодка «Барс».

ПАРЫЖ. Ад пачатку мая да пачатку чэрвеня расейскі рубель упаў з 1,54 фр. да 1,37 фр.

ШТОКГОЛЬМ. Лясные пажары па ўсей Расеі становяць сур'ёзную небаспеку. У ваколіцах Красноярска лясны пажар трывае ўжо цэлы тыдзень. У Аткарску пажар знішчыў вялікіе склады з запасам мільёнаў пудоў вугальля. Былі спробы падпалу, каб вызваць разрухі.

У Кішынёві народ пастанавіў караць сьмерцю зладзееў, грабежцоў і шкодные элемэнты.

ПЕЦЯРБУРГ. Сюды прыехаў кн. Крапоткін. На вагзалі яго спаткалі Керэнскій, члены габінэту і дэлегаты работнікоў.

З усяго сьвету.

ГААГА. Разгром жыдоўскіх крам у Лідсе быў прыгатованы раздачай брашур проці жыдоў. Прычына пагрому — завісць конкурэнтоў.

АФІНЫ. Кароль Константын с каралевай, насьледнікам і іншымі дзяцьмі выехаў у Тарэнт.

ЛОНДОН. «Manchester Guardian» піша:

„Малады кароль можа панаваць гэтулькі часу, скольні захочэ грэцкі народ, каторы сам павінен пастанавіць аб спосабі упраўленьня. Калі ён хочэ рэспублікі, дык ніхай яе мае“.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). Дэлегаты нямецкіх соцыялістоў падалі у Штокгольмі гэткую заяву:

„Мы — проці прылучэньня зямель гвалтам і з гэтай прычыны жадаем звароту утрачэных колоній. На контрыбуцію мы прыстаць ня можэм. Зварот страт зпрычэным у часі вайны краём ня можэ быць узложэн на адну старану. Пад самаапрэдзеленьнем народаў мы разумеем права іх на захаваньне ці стварэньне палітычна незалежнаго быту. Мы жадаем адбудовы Бэльгіі, але яна не павінна стаяцца вассалам ані Англіі, ані Франціі.

„Нямецкая соцыал-дэмократія высказывае найвялікшую сымпатыю Ірландіі, Агіпту, Трыполі, Індіі, Марокко, Тыбэту і Корэі і мае надзею, што соцыялісты тых дзержаў, каторые пануюць над імі, паднімуць свой голас за вызваленьне гэтых націй. Што датычэ Эльзас-Лётарынгіі, дык яна ніколі не была незалежнай нацыональнай дзержавай Толькі 11,4% жыхароў гавораць тамака па францускі. Прынцып міра без аннэксій, вядома, не выключае дзе бы то ні было згодлівых умоў аб папраўцы граніц“.

АФІНЫ. Блокада Грэціі саюзьнікамі закончэна. Спадзяюцца прыезду Вэнізэлоса у Афіны. Каралю Константыну пазволілі ехаць, куды ён хочэ. Яму назначэно 400.000 марак пэнсіі.

Падданые цэнтральных дзержаў будуць выдалены з Грэціі.

ШТОКГОЛЬМ. Прэдстаўнікі нямецкай соцыялістычнай групы большасьці паехалі у Нямеччыну.

ТЭЛЕГРАМЫ.

Нямецкіе апавешчэньня:

15.VI. Заходні тэатр:

Фронт Рупрэхта Баварскаго: У Фляндрыі, між Іпрам і Армант'ер, пасьля вячорнаго барабаннаго агня пачаліся англіцкіе атакі. На фронці Артуа англічане атакавалі нашы акопы на ўсходзі ад Монші, але былі адбіты контратакай. Часць акопу на заходзі ад Буа ді Сар апынуўся ў руках ворагоў. У вечары некалькі варожых батальёнаў атакавалі на ўсходзі ад Лёс, але контратакай мы свае пазыціі выратавалі.

Фронт нямецкаго Насьледніка: Пры Шмэн дэ Дам у вячорных гадзінах развівалася артылерыйская бітва. Нашы дружыны разведчыкоў у розных пунктах прывялі с францускіх акопаў палонных і дабычу.

Усходні тэатр:

Сільны агонь пры Смаргоні, на заходзі ад Луцка і ля чыгунак са Злочова і Галіча ў Тарнополь.

16.VI. Заходні тэатр:

Фронт Рупрэхта Баварскаго: На Фляндрскім фронці баевая чыннасць крапчэла толькі паабедзі. У ваколіцах Варнэтон і Голебэк нашымі батарэямі адбіта атака ворагоў. У некалькіх пунктах фронту Артуа—вострые бітвы. Пры Лёс англічане адкінуты штыкамі. Пры Бількур яны адбіты контратакай. Сягоньня раніцай узняліся новые бітвы пры Монші.

Фронт нямецкаго Насьледніка: Уздоўж Эн і ў заходняй часьці Шампані артылерыйскі агонь шмат крапчэў.

Усходні тэатр:

Без перамен.

17.VI. Заходні тэатр:

Фронт Рупрэхта Баварскаго: У Фляндрыі на поўдні ад Іпра і на поўначы ад Армант'ер артылерыйская бітва крапчэла. На заходзі ад Варнэтон англіцкіе сілы двойчы наступалі, але былі адкінуты. Пры Монші і Круассі англічане раніцай і вечарам вялі атакі. але былі адкінуты і утрацілі 70 душ палоннымі.

Фронт нямецкаго Насьледніка: На фронці Эн агонь момэнтамі даходзіў вялікай сілы. Пры Шмэн дэ Дам нашы дружыны разведчыкоў уварваліся на францускіе пазыціі каля хутара Іртбіз і ўзялі 25 егроў і 4 кулемёты.

Усходні тэатр:

Баевая чыннасць на заходзі ад Луцка, на палудзенным усходзі ад Злочова і ў Карпатах крапчэла. Пры Бэрэжанах адбіто расейскае разведачнае наступленьне.

Македонскі фронт: У даліне Струмы англічане пакінулі некалькі вёсак, перш падпаліўшы іх.

Аустрыяцкіе апавешчэньня.

ВЕНА. 16. VI. **Італьянскі тэатр:** На пагранічным хрыбце на поўдні ад даліны Суганы ўчора узняліся вострые бітвы. Ворагі адкінуты.

ВЕНА. 17.VI. **Італьянскі тэатр:** Аўстрыяцка - вэнгерскіе лятучые эскадры абкідалі шмат дзе бомбамі італьянскіе таборы.

КАЛЯ ВАЙНЫ.

ЛОНДОН. Ніжняя Палата. Правіцельство заявіло, што з Нямеччынай ваюе 13 гасударств Апрыч таго, 9 дзержаў прыпынілі свае дыплёматычные зносіны з ею.

ПАРЫЖ. Міністэр Вівіані, вярнуўшыся з Амэрыкі, сказаў: „Трэба ваеваць да канца, бо Францція не прыстане на благі мір. Амэрыканскіе войскі дадуць нам сільную падмогу. Мы вытрываем да канца!“

БЭРЛІН (В.Т.Б.). Павялічэная чыннасць расейскіх лятучых марскіх сіл вызвала адказ з нашаго боку. 13 чэрвеня нашы лятуны абкідалі Лебару на астраві Эзэлі бомбамі дзеля падпалу і разрыўнымі, а 14—станцію іскроваго тэлеграфу на астраві Руно, ў Рыскай затоцы. 15 чэрвеня нашы лятуны спусьціліся на астраў і зьнішчылі да тла астаткі тэй станціі. Усе лятуны вярнуліся назад.

БЭРЛІН (В. Т. Б.). Эскадра нашых лятучых караблёў у начы с 16 на 17 чэрвеня зрабіла ўдачны налёт на крэпасьці палудзеннай Англіі. Лятучые караблі мелі вострые бітвы з англіцкімі лятучымі караблямі і лятунамі. Наш лятучы карабель Л. 48 узарваўся над морам і пагіб разам з усімі людзьмі. Рэшта ўсе шчасьліва вярнуліся назад.

ЛОНДОН. (Урадова). У часі апошняго нямецкаго налёту на Англію забіты 25 мужчын, 16 кабет і 26 дзяцей, ранены—223 мужчыны, 122 кабеты і 24 дзяцей.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). 14.VI. Прапаў лятучы карабель Л 43. Паводлуг англіцкіх вестак, яго збіў стрэламі англіцкі флот.

БЭРЛІН. (В.Т.Б.). Адзін з нашых марскіх лятуноў 14 чэрвеня атакаваў у усьці Тэмзы вялікі параход і затапіў яго.

ЛОНДОН. Англіцкае адміралцейство апавешчае, што ў апошнім тыдні затоплены 32 параходы і 6 рыбаловаў.

ЛОНДОН (Рэўтэр). Эскадра японскіх мінаносцаў у Сяродземным моры атакавала нямецкіе падводные лодкі. У контрмінаносец Цакакі папала торпэда; забіты 55 душ.

За апошнюю чверць году ў падводнай вайне затоплены 429 англіцкіх параходаў і 111 рыбаловаў.

БЭРЛІН. (В.Т.Б.). У Атлянтыцкім акіані мы ізноў затапілі 23.000 тонн.

БЭРЛІН. (В. Т. Б.). Нашы падводные лодкі ў паўночных водах ізноў затапілі 19,500 тонн.

БЭРЛІН. (В.Т.Б.). У паўночных водах нашы падводные лодкі ізоў затапілі 21 3300 тонн. У Сяродземным моры мы затапілі 32.316 тонн.

ВЕНА. (В.Т.Б.). Адна з аўстрыяцкіх падводных лодак затапіла ў Сяродземным моры англіцкі контрмінаносец клясы Л.

БУКАРЭШТ. Вываз з Румыніі збожжа узрастае. Бываюць дні, калі чыгункамі і па Дунаю вывозяць гэтулькі збожжа, што яго хапіло бы на пракорм 100 мільёнаў людзей на 1 дзень.

ПАРЫЖ. Жоннар вёў з афінскім урадам перэгаворы аб выдачы саюзьнікам грэцкай артылерыі і амуніціі. У грэцкай арміі забяруць аружжэ, і ва ўсей Грэціі адбудзецца набор дабравольцаў для саюзьнікоў.

Друкавана у друкарні М. Кухты. **Выдавецтво «Гоман».** **Редактар Язэп Салавей.**